Год II. Пятніца, 11 лютага (феўраля) 1921 г. № 6.

НАША ДУМКА

Палітычная, экономічная і літэратурная тыднёвая газэта

ПАДПІСКА: на 3 месяцы 75 марак або 5 ф. мукі. | Цана асоб. нумэру 6 марак. | Адрэс: Вільня, Вострабрамская 5 (Пасаж).

Школьныя заметкі.

„Насілаўскі сьвяшчэньнік А. павеў агітацыю проціў беларускае школы“ (Наша Думка, № 5, 1921 г.).

Сярод духавенства нашага беларускага народу, як каталіцкага, так і праваслаўнага, ёсьць у цяперашні час досыць многа такіх, пра каторых можна сказаць, што „хаць яны і нашая костка, але сабачым мясам абрасьлі“...*)

Разумеецца, і ня толькі сярод духавенства, а і наагул сярод нашай інтэлігэнцыі беларускай і навет поўінтэлігэнцыі ёсьць многа абросшых не сваім мясам.

Беларус, як беларус. Урадзіўся ад бацькоў-беларусаў, жыў ўвесь час сярод беларусаў, піў і еў беларускае дабро, гаворыць, што любіў і любіць свой край і народ, але што датычыць школы беларускай, роднай культуры і мовы і г. д., то тут-та і пачынаецца гісторыя...— ксёндз, сьвяшчэньнік, інтэлігэнт,— беларусы вядуць падчас агітацыю проціў беларускае школы і навет усяго беларускага.

У чым тут справа? У чым загадка такога зьявішча? Безварункова, главнай прычынай такога зьявішча ёсьць школьнае выхаваньне.

Большасьць беларускай інтэлігенцыі выхоўвалася ў школах расейскіх, у якіх пры старым рэжыме маладым хлапцом і дзяўчатам штучна прышчэплівалася любоў да усяго расейскага, а аб сваім беларускім навет і не успаміналася. У падручніках гісторыі, географіі, літэратуры ні адным словам не гаварылася пра Беларусь. Замест гэтага тэрміну старанна ужываўся тэрмін „Сѣверо-Западный Край“.

Меншая частка беларускай інтэлігенцыі, выхаваная ў польскіх школах, таксама дэнацыяналізіравалася ў іх. Там вучылі пра Польшчу. Такім чынам ня дзіва, што наша інтэлігенцыя, выхаваная ў расейскіх і польскіх школах, цягне покуль што—хто ў расейскі, а хто ў польскі бок.

Апрача таго, што школа пры старым рэжыме штучна русіфіцыравала вучняў ўсіх узростаў, увесь дзяржаўны апарат вёў змаганьне з асобнымі нацыянальнасьцямі, уваходзіўшымі ў склад Расейскай Дзяржавы. Даходзіла да таго, што пісаць або навет гаварыць аб Беларусі было не басьпечна. Паўсюдых і за усімі сачыла „недрэманае вока“, каб засадзіць у вастрог, як вольнадумцаў, сэпаратыстаў, унутраных ворагаў. Такімі спасабамі і у школьнай і агульнай палітыцы праз соткі гадоў ішло выціскаваньне з нашага жыцьця роднай нашай мовы і культуры і загнаньне іх у кут. Да беларускай інтэлігэнцыі пад чужацкім націскам стала прырастаць чужое „мяса“. Беларускімі-ж у гэтых людзей асталіся толькі „косткі“. Праз соткі гадоў ішло вытручваньне ў душы нашай інтэлігэнцыі нацыянальна-беларускага почуцьця, паважаньня ўсяго роднага; накідвалася замест роднага ўсё чужацкае, як „прекрасный русскій языкъ“, як „piękny język polski“ і г. д.

Сярод самых беларусаў сталі зьўляцца людзі пачужацку настроеныя, адрокшыся ад бацькаўшчыны і змагаючыся ці за русіфікацыю ці за полёнізацыю Беларусі.

Такіх рэнегатаў асабліва многа цяпер сярод духавенства нашай Беларусі. Адны з іх цягнуць у Маскву, другія—ў Варшаву.

Яны маюць магчымасьць выкарыстываць для варожай нам антыбеларускай агітацыі і школу і касьцёл або царкву.

Мы амаль нічога ня можам зрабіць з іх варожай нам агітацыяй у царкве і касьцёле, бо гэта справа вышэйшых духоўных сфэр, як каталіцкіх так і праваслаўных, каторыя павінны-б строга забараніць ксяндзам і сьвяшчэньнікам займацца палітыкай у царкве і касьцёле. Што-ж датычыць школ, то тут мы можам даць рады, бо школьная справа патроху пераходзіць у нашы рукі, і мы верым у вялікую будучыню беларускай школы. Ад беларускіх вучыцялёў і вучыцеляк многае залежыць тут. Іх цьвёрдасьць, вытрываласьць, сьвятая вера ў адраджэньне, з каранём вырве чужацкія наросты на нашых касьцёх, і няхай ведаюць насілаўскія і усякія іншыя агітатары проціў беларускай школы, што бацькаўшчына запіша некалі іх імяньні на чорную дошку зраднікаў і рэнегатаў Беларусі.

І. М.

*) З прамовы Івана Мялешкі, канцыляна Смаленскага, у Варшаўскім Сойме.

Беларускае пытаньне у польскім сойме.

Закрыцьце Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Горадні, неахвота польскіх інспэктароў аплачываць вучыцялёў беларускіх школ, чысьленыя арышты беларускіх дзеячоў, закрываньне газэт— усе гэтыя факты, меўшыя месца ў часьці Беларусі, алдадзенай Польшчы бальшавікамі, выклікалі ў польскім сойме ў Варшаве голас пратэсту з боку прадстаўніка польскіх соцыялістаў, дэпутата Земенцкага.

„Учора (4 лютага)—піша „Robotnik“—сойм займаўся справай увядзеньня на усходніх землях нашага гаспадарства дзяржаўнэе адміністрацыі, а также устанаўленьня асноў права, да якіх мае датарнавацца праўнае палажэньне гэтых зямель.

„Тов. Земенцкі ў моцнай прамове асьвяціў скандальную палітыку акраінных царкоў, якія прасьледуюць нацыянальны беларускі і ўкраінскі рух. Гэта палітыка можа давясьці да небясьпечных для цэласьці дзяржавы вынікаў. Міністэр Скульскі пробаваў вытлумачыць паступкі прыслухаючых яму чыноўнікаў, але зрабіў гэта вельмі няўдала і легкамысна, вінавацячы нацыянальны беларускі і ўкраінскі рух ў камуністычных тэндэнцыях“.

Чытаючы гэту заметку, мы з радасьцю адзначаем, што ўрэшце пачуўся польскі голас пратэсту проці „крэсовай“ палітыкі польскага ўраду, крыўднай для беларусаў. Праўда, нельга яго лічыць голасам усяе партыі польскіх соцыялістаў, а хутчэй трэба прыпісаць асабіста грам. Земенцкаму: пакуль ад імя партыі прамаўляў пан Недзялкоўскі— зоолёгічны нацыяналіст, датуль і партыя падтрымлівала ўрадовую палітыку проці беларусаў. Усё-ж неяк на душы робіцца лягчэй, бачучы, што-ткі ня ўсе палякі захоплены шалам нацыяналізму!

Затое вельмі сумнае ўражаньне робіць выступленьне міністра Скульскага. Некалі расейскія царскія міністры выступалі проці беларускага руху, кажучы, што гэта работа „польскіх паноў“. Пад той-жа час польскія паны казалі, што яны ня могуць пагадзіцца з беларускім рухам бо яго вядуць... маскоўскія чарнасоценцы! Пан Скульскі добра памятае гэныя часы і чарпае з іх навуку, зробіўшы малую зьмену, вымаганую жыцьцём: тады для палякоў было страшна чарнасоценства — і беларусаў хрысьцілі ў чарнасоценцы; і цяпер Польшча як агню баіцца камунізму— вось, значыцца, беларусы і ёсьць камуністы.

Гэткі спосаб распраўляцца з беларускім рухам сьведчыць толькі аб злой волі таго, хто яго выдумаў. І трэба адзначыць, што так прамаўляе ў сойме, чалавек, каторы колькі тыдняў таму назад казаў прадстаўнікам беларусаў:

«Калі Савецкая Расея сур'ёзна будзе падтрымліваць ваш рух, дык мы ня тое, што дамо вам волю, а будзем прасіць вас і прымушаць, каб вы тут, у вас залажылі гняздо беларускае работы. Калі-ж не,—ну, дык за гадоў пяцьдзесят сьледу ад вас не астанецца!»

Мы думаем, аднак, што спадзяваньні пана Скульскага—лішне оптымістычныя: больш за сто гадоў панавала над намі Расея, забараняла яна ня толькі вучыцца пабеларуску, але і пісаць і друкаваць, і ўсё-ж нас праглынуць не здалела. А было-ж гэта ў часе нічым не абмяжованай самадзяржаўнай уласьці! Дык не праглыне нас і Польшча. Не праглыне бо цяпер беларускі рух становіць сілу, ў шмат разоў вялікшую, чымся пад Расеяй; бо ў самой Польшчы ўласьць ураду будзе агранічана народам; бо, ўрэшце, граніцы польскае дзяржавы йшчэ аканчальна не ўстаноўлены, і пытаньне аб істнаваньні незалежнае Беларусі астаецца адкрытым.

А. Л.

Паводле справаздачы з засяданьня сойму 4 лютага дэпутат Земенцкі сказаў паміж іншым:

„Усходнія акраіны („Kresy Wschodnie“) маюць зусім іншы характар, чым шчыра польскія землі—перш за усе дзеля таго, што насяленьне у іх мяшанае.

У праекце (статуту аб адміністрацыі) есьць некалькі вельмі пекных артыкулаў аб раўнапраўстве нацыянальнасьцяў, але мы баімся, што яны астануцца мертвай літэрай, бо бачым, што урадовая практыка ужо пачала ісьці у кірунку уціску украінскага і беларускага насяленьня. Робіцца гэта як у Львове, так і у Горадні. Гэткая палітыка толькі узмацовывае варожыя для Польшчы кірункі, і ужо з гэтае прычыны, калі не дзеля справядлівасьці, урад павінен пайсьці па другой дарозе.

У адміністрацыйнай камісіі навет правыя дэпутаты высказалі дамаганьне, каб былі здаволены прасьветныя патрэбы беларускага і украінскага насяленьня. Мы бы жадалі, каб прынамся у гэтых вузкіх межах раўнапраўства не асталося пустым гукам. Тымчасам мы маем ведамасьці, што уласьці робяць перашкоды беларускім і украінскім школам.

Дзеля гэтых прычын соцыялісты ня прымуць учасьця у галасаваньні аб статуце.“

(Robotnik.)

Да амэрыканскіх беларусаў.

У Амэрыцы ёсьць дужа многа беларусаў. Былі такія гады перад вайною, што з некаторых мястэчак і вёсак павыяжджалі амаль ня ўсе маладыя, як хлопцы, так і дзяўчаты. Рэдкія з іх зарабіўшы добрыя грошы, паварочаліся назад. Найболей такіх, што засталіся там на даўжэйшы час або і на усё жыцьцё і да сябе выпісалі бліжэйшую радню. А навет тыя, што вярнуліся з Амэрыкі, цяпер шкадуюць і хочуць вярнуцца туды зноў і шмат хто ўжо паехаў.

Але што мы ведаем аб сваіх амэрыканскіх братох? Толькі тое, што большасьці з іх жывецца там дужа добра, што яны зарабляюць добрыя грошы і быццам забыліся на гаротную старонку сваіх бацькоў. Болей нічога ня ведаем. У газэтах можна прачытаць аб амэрыканскіх арганізацыях ліцьвіноў, украінцаў, палякоў, расейцаў, але ніколі да гэтага часу не давялося мне прачытаць аб арганізацыі амэрыканскіх беларусаў. Відаць, яны там далучаюцца, гледзячы па веры, праваслаўныя да маскоўцаў, а каталікі да палякоў, або жывуць зусім без арганізацыі.

Праўда, колькі месяцаў таму назад адзін беларускі дзеяч прывёз з Варшавы нязвычайныя весткі аб тым, што ў Варшаве сядзіць беларуская дэлегацыя з Амэрыкі, што ў адным Чыкаго ёсьць ажно 30 тысяч арганізаваных беларусаў, што ў Амэрыцы ідзець самая шырокая беларуская работа і што „ўвесь ратунак

для нас, прынамсі з грашовага боку, толькі там, у дзівоснай старонцы доляраў, сыплючыхся проста з неба. Хацелася верыць яго словам. І вось віленскае беларускае грамадзянства, хаця і дзівілася, што гэта мае быць за дэлегацыя, якая сядзіць там у Варшаве, а не магла знайці Вільні і Горадні, аднака, тою навіною дужа зацікавілася, паважна абмеркавала яе і навет вызначыла кандыдатаў ехаць ў Амэрыку дзеля зьвязку з тамтэйшымі беларусамі і дзеля арганізацыйна-агітацыйнае работы сярод іх. Ня мала ўжо часу мінулася з тае пары, але нічога ня чуваць.

Яшчэ адзін фантавёр казаў, што ён, быўшы ў Рызе, у беларускай місіі ці дзе там, відзіў „вялікую штодзенную беларускую газэту, якая выходзіць ў Амэрыцы“.

Дужа хочацца верыць, каб і ў гэтай навіне была хоць сёмая доля праўды, каб газэта была хоць тыднёвая, бо ў штодзенную зусім ня верыцца.

Чаму ня верыцца?

Таму, што каб ў Амэрыцы было штось падобнае, дык тамтэйшыя нашы працаўнікі знайшлі-бы спосаб паведаміць аб сваім існаваньні, аб сваім жыцьцібыцьці ўсё беларускае грамадзянства, а ня толькі Варшаву або Рыгу. І паведаміла-бы яго сур'езным, паважным шляхам, а не праз фантазёраў і прыпадковых падарожных языкатых людзей.

У канторы «Нашае Думкі» я даведаўся, што некалькі нумароў газэты пасылаецца ў Амэрыку. Ці-ж гэтыя падпішчыкі не маглі-бы памагчы зьвязацца нам з усім беларускім грамадзянствам ў Амэрыцы? Хай напішуць у рэдакцыю, ці праўда, што ёсьць у Чыкаго 30,000 арганізаваных беларусаў, а калі праўда, то хай прышлюць адрэс арганізацыі. Калі выходзіць газета беларуская, хай прышлюць колькі нумароў яе, а перадусім—яе адрэс. Калі-ж бы там нічога падобнага ня было, то іх сьвяты абавязак, як сьвядомых, выпісваючых сваю газэту людзей, распачаць там арганізацыю беларусаў. Перш-наперш, браты, пусьцеце там у польскія, расейскія, літоўскія, украінскія і іншыя газэты абвестку, што выходзіць «Наша Думка» і іншыя беларускія газэты, якія можна выпісываць ў Амэрыку і якія дадуць амэрыканскаму беларусу сумны абраз жыцьця яго бацькаўшчыны.

Траплялася чуць, ці праўда, ці не, што «Польска Партыя Социялістычна» вядзе ўсю сваю працу на грошы амэрыканскіх палякоў-пэпэсаў. Украінцы і Ліцьвіны маюць ў Амэрыцы моцную апору для будаваньня незалежнасьці Украіны і Літвы. Таксама і іншыя адраджоныя народы. Аб жыдох няма што і казаць. Яны дастаюць ад сваіх амэрыканскіх братоў вялікія міліёны, на якія кормяць дзесяткі тысяч абяздоленых вайною, бедных сем'яў, утрымліваюць школы і прытулкі, друкуюць кніжкі і газэты. І толькі адны мы ня маем ніякай помачы ад сваіх амэрыканцаў, хоць ніхто столькі не паеў травы, як згаладнелыя беларусы-бежанцы, нікога столькі не паўмірала ад голаду і пошасьцей, як беларусаў, ніхто ня жыве у гэткай цемнаце, як пазбаўленыя школы, кнігі і газэты беларускія сяляне, ніхто так ня зьвязан у сваей рабоце няхватам грошы, як беларускія арганізацыі, культурныя і палітычныя. Узяць хоць бы газэту, хоць-бы ж тую „Нашу Думку“. Вядома, што цяпер ніводная газэта ня можа быць без грашавой дапамогі з боку, а пагатоў таго—беларуская газэта. Беларусы ня маюць сярод сябе заможных людзей, якія давалі-бы вялікія афяры на газэту. А каб газэту паставіць на ногі, трэба грошы не малыя. І дзеля гэтага таксама перш-наперш патрэбна арганізаванасьць беларускага сялянства, якой няма і якую зрабіць бяз грошы таксама немагчыма. Дык вось і „Наша Думка“, ня гледзячы на тое, што яна дужа ходка пашыраецца і набіраецца моцы, аднак, на тыя грошы, якія склалі на яе сьвядомыя беларусы, ня можа ўдзержыцца да пераходу на кошт падпішчыкаў. Бяз помачы збоку яна, бязумоўна, зачыніцца. Ці-ж яе сьвядомыя падпішчыкі, амэрыканскія беларусы, не маглі бы памагчы, арганізаваўшы там сваіх таварышоў-работнікаў і сабраўшы з іх хаця-бы самы невялічкі ўзнос на фонд газэты. Пры валюце доляра ў 800 польскіх марак дзеля забасьпечанага працаю амэрыканскага работніка гэта было зусім ня цяжка. Беларускае Выдавецкае Таварыства, як я чуў ад старшыні яго, паважанага грамадзяніна М. Гарэцкага, таксама перажывае страшэнны грашовы крызіс і ня можа друкаваць кніжкі ў патрэбным ліку. І беларуская школьная справа, як і наагул справа беларускага адраджэньня замінаецца няхватам літэратуры і першым чынам нястачаю школьных кніжак. Ці-ж так павінна быць, мае любыя браткі?

Адгукнецеся, нашы людцы, з сваей далёкае Амэрыкі! Памажэце будаваць бацькаўшчыну, якую вы з болем у сэрцы павінны былі пакінуць, шукаючы штодзеннага кавалка хлеба, і якая цяпер ня мае навет гэтага кавалка. А можа-ж Бог судзіць яшчэ вярнуцца вам назад.

Згуртуйцеся там у моцныя арганізацыі і шукайце зьвязку з арганізацыямі ў бацькаўшчыне. Ратуйце бацькаўшчыну.

Дзед Кузьма.

1/II—1921 г.
Новая-Вялейка.

Пачынаюць разумець.

Парыжская конфэрэнцыя расейскага Устаноўчага Сойму, дзе сабраліся такія гучныя іменьні, як Мілюкоў, Керэнскі, Чэрноў, ня можа ніяк адрачыся ад свае, хворае ў наш час, ідэі велікадзяржаўнасьці.

Чэрноў проста заяўляе, што як толькі зваліцца ў Расеі ўлада бальшавікоў, дык ён скліча Усерасейскі Устаноўчы Сойм, як Старшыня яго.

Навет такія досіць разумныя людзі, як быўшы старшыня быўшага Устаноўчага Сойму быўшае Расеі, дасюль яшчэ ня могуць ачуняць ад цяжкага чаду „ўсерасейшчыны“, ад тэорыі назаўсёды памершага імпэрыялізму.

Есьць, аднак, і сярод безработных расейскіх эмігрантаў людзі, які пачынаюць разумець, што памершае Вялікае Рымскае Імпэрыі нельга было ажывіць навет у меньш дэмократычныя часы як цяпер.

Ніякаю сілаю нельга ажывіць і нябожчыцу нашых дзён Імпэрыю Расейскую.

Бастылія народаў раскідана рэволюцыяй і аднаўляць яе нікому няма патрэбы, апрача хіба п.п. Мілюковых, Чэрновых ды Керэнскіх.

Гэта палітычная аксіома адндаўніх часаў зрабілася яснаю для варшаўскіх расейцаў з п. Савінкавым на чале.

Ня вельмі даўно ў органе п. Савінкава „Свобода“ мы чыталі на самым першым месцы аб непатрэбнасьці Усерасейскага Устаноўчага Сойму.

У тэй самай „Свабодзе“ (№ 12. 13. 1921) зьявіўся артыкул п. Б. Савінкава „О некоторых фикциях“, дзе на заяву ў Парыжы Чэрновага чытаем такі адказ: „Так, Устаноўчы Сойм будзе склікана, але не Чэрновым, а невядомым валасным старшынёю, але не Усерасейскі, а Маскоўскі, але не з Парыжа, а з Крэмля“.

Так, п. Савінкаў, маскоўцы маюць поўнае права склікаць свой маскоўскі Устаноўчы Сойм.

Пану Савінкаву час ужо прызнацца (разумее ён гэта добра), што „расейцы“ існавалі ў мінуўшчыне, а цяпер істнуюць вольныя: грузіны, эсты, латышы, палякі, літоўцы і г. д.

Ня можна далучыць да іх беларусаў, украінцаў, бо хаця істнаваньне іх даказваці няма чаго, але ім не хапае волі—маскоўскі імпэрыялізм, хоць і чырвоны, пануе яшчэ над імі.

Праўда, над намі і братамі нашымі украінцамі пануе крыху і іншы яшчэ імпэрыялізм, але аб гэтым пагаворым з п. Савінкавым у лепшыя часы.

А гаварыць з прадстаўнікамі расейскае дэмократыі тыпу Б. Савінкава нам ня шкодзіць, бо ці рана, ці позна, яны павінны прыйсьці да прыкананьня, што рамкі іх дзяржаўных ідэалаў павінны павузець тэрыторыяльна да тэрыторыі, якую займае іх родны шматдзесятміліённы, велікарускі народ. Аб яго долі, аб самавызначэньні і трэба дбаць масавай расейскай інтэлігэнцыі.

Бо самі прадстаўнікі гэтае інтэлігэнцыі з групы таго самага Б. Савінкава (Філософаў ці Одынец) прызнаюць, што „велікадзяржаўнасьць ніколі не азначалася веліччу тэрыторыі“.

І гэта мы ведаем. Мы навет ведаем і тое, што Расея ня была „великой“, але праўда была вельмі „большой“.

Дык вось тут і выходзіць, што расейскай дэмакратыі ня грэх было-б узяцца за стварэньне свае „вялікае“ Расеі (Велікаросіі) а „большую“ няхай сабе пробуюць рабіць розныя Врангелі, Юдэнічы, Дэнікіны, Керэнскія і іншыя вялікія палітычныя нябожчыкі.

Самавызначэньне велікарускага народу мы будзем толькі вітаць, бо, заняўшыся сваімі хатнімі справамі, ён спакой дасьць нам; са сваей доляй мы будзем рахавацца самі. Гэта першае.

А другое — шануючы сваю волю і б'ючыся за самабытнасьць сваю, мы шануем гэткае самае права кожнае нацыі.

У гэтым вось наш голы, не пахварбаваны дэмакратызм.

Нас пачынаюць разумець і хутка саўсім зразумеюць.

Краўцоў Макар.

Лодзь 18. I. 1921.

Беларусы і жыды.

Блізка што ўва ўсіх літэратурных мовах сьвету ёсьць пісьменьнікі родам жыды.

Адзін з лепшых сучасных пісьменьнікаў і поэтаў беларускіх, вядомы Зьмітрок Бядуля—таксама жыд Вялейскага павету

У творах жыдоўскага клясыка Абрамовіча (Мэндэле Мойхэр Сфорым), што быў родам з Капыля Менскай губэрні, заўсёды чуюцца нашы родныя беларускія мотывы.

Жыдоўскі пісьменьнік Абраам Мапу, пісаўшы свой біблейны роман з ідылічных часоў цара Хізкія і прарока Ісая, маляваў ціхі Бэтляхам, быўшы натхненым прыгожымі ўзьбярэжжамі беларускага Нёмна.

Знаменіты жыдоўскі пісьменьнік з часаў „haskola“ (ацраджэньня) Перац Смаленскін лічыцца таксама выхванцам Беларусі.

З Валожынскага (Вілен. губ.) «Ешы-

А. КАНЧАР.

Клясавае, нацыянальнае і рэлігійнае змаганьне на Беларусі.*)

(Канчатак).

Тая самая палітыка сэквэстру і раздачы земляў і людзей новым паном цягнулася і пасьля II-га і III падзела Польшчы. Так, па II падзелу да Расеі адыйшло чыншавой шляхты больш за 180 т. чал., уладароў дварамі да 50 тыс. чал. і вялізная колькасьць працоўнага сялянства. Кацярына II па дварах канфіскавала больш за 305 тыс. жыхароў і гэтых рабоў затым у вялікай колькасьці пар-здарывала новым паном. Адабраны былі ў казну двары ўсіх польскіх паноў, якія ўваходзілі ў польскае паўстаньне 1794 г., у тым ліку ад асуджаных на ссылку 12 палякоў і абпалячаных беларусаў паноў, ад 13 асоб, якія прыймалі ўчасьце ў бунце. Адабраныя землі былі перададзены 27 новым паном расейцам, беларусам і ліцьвінам, якія заслужыліся перад расейскай каронай. Так сама былі падараваны новым паном землі і людзі, канфіскаваныя ў цэркваў іншае веры, у старастваў і іншых устаноў.

Новыя паны, ўвайшоўшы ў склад беларускага зямляўласнага шляхоцтва мала, перамянілі ранейшы склад зямянства, або уладзецельнай шляхты.

Яны самі найчасьцей аставаліся на службе у расейскіх цароў, а землі свае аддавалі ў арэнду або прадавалі літоўскай, беларускай і асабліва польскай, як найбольш прадпрыімнай шляхце.

У 1844 годзе па вярхоўнаму загаду ў Беларускіх губэрнях былі ўтвораны асобныя камітэты для штудзаваньня „інвентароў“*) у панскіх дварох і для рэгуліраваньня ўзаемаадносін і паноў і сялян. У 1863 г. беларускія сяляне былі пераведзены на выкуп і скора дасталі ад сваіх паноў (сяляне гаспадарсьцьвеныя ад гаспадарства) надзелы.

У 1887 сярэдні разьмер панскіх двароў, у параўнаваньні з дварамі купцоў, мяшчан і сялян, быў гэткі:

	Дваран.	Купцоў.	Мяшчан	Сялян.
У Магілеўскай губ.	694	771	26	63
„ Менскай „	886	1445	41	36
„ Віцебскай „	588	865	99	85
„ Смаленскай „	357	857	72	63
„ Віленскай „	251	381	41	46
„ Горадзенскай „	429	1213	11	14

Сяляне, якія ўладалі зямлёю па падворнаму і супольнаму праву, г. ё. дасталі надзелы па выкупу 1863 г., мелі у сярэднім (па нормах 1887 г.):

	Был. панскіх.	Былі гаспадар.
У Магілеўскай губ.	3,0	4,8
„ Менскай „	3,8	5,0
„ Віцебскай „	3,0	4,9
„ Смаленскай „	3,7	5,1
„ Віленскай „	2,9	4,3
„ Горадзенскай „	2,7	4,3

Ціфры гэтыя паказываюць дрэннае зямельнае становішча сялянскага надзельнага кляса, малазаважнае становішча прыватнаўласьніцкай групы сялянства і пераважнае становішча дваранскага і купецкага зямельнага кляса. У разультаце вялікія маёнткі на Беларусі займалі першае месца: яны займалі да 85 прац. усей зямлі ў губэрнях, у тым ліку двары, у якіх было больш за 5000 дзес. займалі ў Магілеўскай губ. 36 прац., у Менскай—63 прац., у Віцебскай — 36 прац., Смаленскай — 19 прац., Віленскай — 25 прац., Горадзенскай — 31 прац. усей зямлі ў губэрні.

З таго часу абраз зямляўладаньня зьмяніўся. Шмат шляхты не дадзяржала і свае землі прадала і прагуляла ў карты, але значная большасьць магнатаў-багатыроў і далей ўладала сваімі вялізнымі дварамі.

Характэрна адзначыць, што зямянскі кляс, званы пасьля падзелаў Польшчы і законадацельства рускіх цароў, клясам дваранскім, у пэрыяд з 1793 па 1904 г., г. ё. у працягу 100 год, блізка што не дапушчаецца да ўпраўленьня краем, апрача Смаленскай губэрні і беларускіх паветаў другіх губэрняў, дзе было ўведзена земскае палажэньне 1864 г. У краі ўсе адміністратыўныя функцыі (абавязкі) былі сабраны ў руках урaднікаў (чыноўнікаў), якія змагаюцца ня толькі з беларускай самабытнасьцю, але і з польска-шляхоцкім элемэнтам дваранскага кляса. З 1907 г. у краі ўводзіцца палажэньне 1903 года аб упраўленьні земскаю гаспадаркаю. Разультатам гэтай рэформы было тое, што бюджэт беларускіх губэрняў к 1905 году падняўся на 65 прац. а дваранскі кляс шчыльна падступіў к сыстэме ўпраўленьня краем.

У канцы імпэрыі Сталыпін увёў у Менскай, Магілеўскай і Віцебскай губ. так званае нацыянальна—цэнзавое (Сталыпінскае) земства. У яго ўвайшоў 1 прадстаўнік ад сялян павету, прадстаўнікі духавенства і ўраднікаў і значная частка паноў-зямляўласьнікаў. З гэтага мамэнту дваранскі кляс на Беларусі запанаваў над культурным і гаспадарчым жыцьцём працоўнага сялянскага кляса, а польскія патранаты дасталі новыя срэдствы для правядзеньня ў краі польскіх нацыянальных заданьняў.

*) Гл. № 4 і 5 „Н. Д.“.

*) Інвентарамі на Беларусі называліся правы і абавязкі гаспадарсьцьвеных сялян. Паны мусілі мяркавацца з гэтымі інвентарамі у сваіх дварох. Інвентары былі прызнаны абавязковымі у кожным двары, але аднаго агульнага правіла для іх ня было, [illegible] разнаабразіліся паміж сабой

бота» выйшаў знамяніты жыдоўскі поэт Х. Н. Бялік.

У Беларуска-Літоўскім Князьстве высокую дзяржаўную пасаду займаў пярэхрыст (няма чаго дзівіцца, што ў тых часох няхрышчоных ня прыймалі на гэткія службы) Абрам Язэфавіч Рэбічковіч, каторы пры Жыгімонце І дайшоў да пасады падскарбія земскага (міністра фінансаў) і сябра Рады.

Першы пасля ўцёку бальшавікоў з Менску Сэкрэтарыят Беларусі меў у сваім складзе жыдоў: Гутмана (без партфэля) і Белкінда—сэкрэтара фінансаў.

На першым сялянскім зьездзе ў Менску, што быў скліканы Беларускім Нацыянальным Камітэтам 4-га красавіка 1917 г., дэлегатам ад Паўлавіцкай воласьці Магілеўскай губ. і павету, быў жыд Мордух Янкеляў Зільбэрман. Ен там сельскім старастаю ўжо 30 гадоў.

Лічу за прыемнасьць гэткаю добраю памяткаю пачаць сваю мову аб нашай жыдоўскай інтэлігенцыі.

Надыйшлі вялікія часы, калі сьвядомыя беларускія грамадзяне-жыды мусяць безадкладна абмёркаваць і ўзважыць свае адносіны да нашага „haskola" і да будаваньня новага жыцьця на Беларусі.

Надыйшлі вялікія часы, калі рух „беларускага адраджэньня" вышаў з тэй пары, што можна было не зважаць на яго.

Бо з ім цяпер шчыльна складаецца доля ўсяе Беларусі, а гэта значыць і далейшая доля жыдоўскага грамадзянства на Беларусі.

І беларускія жыды мусяць або працівіцца беларускаму руху або спагадаць і дапамагаць яму.

Якім-жа шляхам ідзе наша жыдоўская інтэлігенцыя?

Спачатку рэвалюцыі, калі беларусы ў Менску пачалі выступаць пад сваім уласным штандарам, гарачэй за ўсіх віталі іх жыды.

З другога боку, да апошніх часоў было сярод жыдоў досыць многа і працiўнікаў нашага руху.

Галоўным чынам моцна абмаскаленая жыдоўская моладзь да гэтага часу ня хоча зразумець ідэі беларускага адраджэньня і часам вельмі шкодзіць беларускай рабоце як сярод мястовых работнікаў, так і сярод сялян. Прычынай, чаму так робіць гэтая моладзь, ёсьць яе несьвядомасьць у беларускай справе, і толькі. І нам асабіста вядома, што пасьля заклiку да жыдоўскай інтэлігенцыі, з якім зьвярнулася вясною 1919 г. віленская „Беларуская Думка", беларусы-адраджэнцы прыдбалі ня мала гарачых спагадачоў і навет дзейных прыхільнікаў з паміж тых жыдоўскіх грамадзян, якія захацелі бліжэй пазнаць беларускі рух і пазналі яго.

Дык можна толькі пажадаць, каб і жыдоўская прэса болей давала свайму грамадзянству патрэбнай веды аб яго бліжэйшым суседзе—беларусах.

Калі пажаданьне гэтае зьвязаць з тым, што дзеецца на заходніх ускрайках Беларусі, дык вага яго асабліва кідаецца ў вочы.

Вядома, што жыдоўскія мястэчкі сярод сялянскіх вёсак зьяўляюцца свайго рода культурнымі асяродкамі, дзе болей пісьменных людзей, болей сьвядомасьці ў палітычным жыцьці, часьцей бывае газэта і кніга. І наагул жыдоўскае грамадзянства мястэчак стаіць вышэй за сялянскае масы ў справах грамадзкага жыцьця.

І вось, каб там была такая-ж згода ў беларусаў з жыдамі, якую выказала прыкладам, жыдоўскае і беларускае грамадзянства ў справе выбараў у сойм, то было-б шмат карысьці дзеля абеіх нацый, а разам з тым і дзеля ўсяе старонкі.

Тым жыдом, якія дагэтуль яшчэ застаюцца несьвядомымі русіфікатарамі, мы гаворым:—годзе! сплачывайце доўг беларускаму мужыцкаму народу і так рабеце лепшую будучыню і дзеля сябе самых. Бярэце прыклад з сваіх братоў, якія зразумелі нас, і мы будзема шанаваць і любіць вас, як шануем і любім іх. Вы, меўшыя магчымасьць здабыць сьвятло навукі, навучайце „тутэйшага" быць беларусам і грамадзянінам. Вы, жывучыя спрадвеку побач з беларускім народам, заглянiце ў яго душу, пацікаўцеся ёю і, калі можаце, памажыце ёй.

А. Мсьціслаўскі.

З беларускага друку.

Віленская беларуская газэта „Кгупіса", орган хрысьціянска-дэмакратычнай партыі, ў артыкуле „Сойму ў Вільні ня будзе" піша:

„Спосаб, якім так званая „Сярэдняя Літва" пачала сваю ў нас гаспадарку, выразна вёў да таго, што мы цяпер маем. А маем мы цяпер проста нічога: ані Сойму, ані Сярэдняе Літвы. Беларускі, Літоўскі і Жыдоўскі нацыянальныя Камітэты, адмаўляючыся ад удзела ў выбарах у Сойм пры сучасных варунках, паказалі свой вялікі палітычны розум і празорлівасьць. Для гэтых камітэтаў трох народнасьцей было ясным, што Сярэдняя Літва і Сойм ў Вільні гэта пераходная ступень да Польшчы, і што пажаданьні невялічкага кружка польскіх тутэйшых дэмакратаў, жадаючых палітычнай незалежнасьці нашага краю, споўніцца не маглі. У нас пакуль што усёмагучая панская эндэцыя, іншыя-ж польскія палітычныя групы бязсільны. Яны сваю слабасьць выказалі ўжо даўно. Апрача таго, Беларусам, Літоўцам і Жыдам было ня менш ясным, што Ліга Народаў усёжткі не пазволіць на такое несправядлівае вырашэньне лёсу нашага краю, якое зьбіралася зрабіцца праз гэны нядойшлы Сойм. Ліга Народаў ведала, што Сойм у такіх варунках ня быў бы выяўленьнем вольнай волі люднасьці. І так нашы разважаньні споўніліся. Жэлігоўскі у дэкрэце № 74 піша, што спаўняючы пажаданьні Польскага Ураду, скліканьне Сойму ў Вільні адкладаець на час неазначаны, гэта знача назаўсёды.

Тымчасам усім нам ведама, што зямля наша спорная між Літвой і Беларусяй з аднаго боку, і Польшчай з другога. Дык што будзе? Ліга Народаў бярэць нас пад свой фартучок і думае зрабіць плебісцыт, ці інакш кажучы: запытаюцца аб палітычнай прыналежнасьці кожнага грамадзяніна нашага Краю пры такіх варунках, калі ён зможа адказаць зусім вольна і бязбаязна; калі ня будзе ніякага чужога войска, а ўлада будзе складацца з прадстаўнікоў усіх народаў нашага краю.

Мы, Беларусы, чакаючы гэтага плебісцыту, павінны яшчэ шырэй разьвіць працу народнага і палітычнага ўсьведамленьня нашага сярмяжнага Беларуса, лепш паставіць працу культурна-выдавецкую і больш аб'яднацца з Літоўскай дэмакратыяй. А як варункі, пры якіх мы згодзімся на плебісцыт, між іншым, павінна быць і тое, што плебісцыт мусіць адбыцца ня толькі ў Віленшчыне, але ў Гродзеншчыне (апрача Бельскага, Сакольскага і Беластоцкага паветаў) і ўва ўсей Беларусі, дзе дагэтуль сядзіць польскае войска, гэта знача: і ў так званым „польскім калідоры". А куды народ наш хоча належыць, мусім дамагацца, каб гэта пытаньне ставілася так: да Літвы і Беларусі (разам) з аднаго боку і да Польшчы з другога.

Але пакуль усё гэта абгаворыцца і абдумаецца, пакуль дойдзе да справядлівага плебісцыту, шмат вады ўплыве ў мора."

З друку.

У № 464 „Виленскаго курьера" зьявіўся артыкул, пасьвячоны вядомаму правадыру расейскай белагвардзейшчыны—генаралу Булак-Балаховічу.

У тым-жа № зьмешчан „загад" яго, у якім пішацца вось што:

«У поўнай згодзе з выказанай паўстаўшымі беларускімі атрадамі воляю абвяшчаю: 1) усе паўстаўшыя у Беларусі атрады, таксама і рэгулярныя войскі, знаходзяцца пад маім беспасрэдным камандаваньнем; 2) з усіх урадаў, якія называюць сябе беларускімі, будзе прызнаны толькі той, які апіраецца на беларускае сялянства, працуець на карысьць незалежнай Беларусі і дзеліць з ім яго бяду і гора; 3) урад, які у цяперашні час лічыць сябе беларускаю уладаю—маець уладу толькі на паперы, бо сябры яго разьяжджаюць па чужых старонах і, ня маючы нічога супольнага з народам, перашкаджаюць ходу справы вызваленьня народу з-пад бальшавіцкага ярма і дзеля таго я абвяшчаю яго ворагам беларускага народа; 4) усіх, каму дарагая бацькаўшчына, заклікаю да працы пад маім камандаваньнем. Бацька Булак-Балаховіч.»

Разглядаючы гэты „загад" паказаная газэта зусім справядліва пішаць:

„Прымушаны апасьля паражкі сваіх дапраўды разбойніцкіх атрадаў ударыць у капыты пад дабратворную пакрыўку Польшчы, ген. Булак-Балаховіч не здабыў аканчальнай ціхамірнасьці у бясклопатным існаваньні у Варшаве. „Як воўка ні карміен усе у лес глядзіць" і „асвоены" часова бацька йзноў пачынае цягнуць сваю старую песьню і рыхтуецца ізноў вылезьці на сцэну абаронцам беларускае самастойнасьці."

„Ня прызнаны партызанскімі беларускімі атрадамі „бацька" абвяшчае сябе, аднак, камандзірам іх і навет рэгулярных паўстаўшых войскаў."

„З дзіўною бясцэрамоннасьцю бацька прысабечывае правы з'цвярджэньня беларускага ураду, „які апіраецца на беларускае сялянства і дзеліць з ім яго патрэбы і гора"—забываючы, відочна, што „патрэбы і гора" беларускага сялянства паўрад ці дзяліў сам „бацька", не адмаўляўшы сабе ні у чым, у поўнасьці, што патрэбныя яму кошты заўсягды паплывуць шырокаю рэчкаю".

Урэшцэ газэта кажа, што беларусы не памыляцца ў тым, хто вораг беларускага народа": ці „няпрошаны бацька" ці законны ўрад Беларусі, на чале якога стаіць вядомы беларускі дзеяч Вацлаў Ластоўскі, які ўсё сваё многапакутнае жыцьцё аддаў на змаганьне за незалежнасьць бацькаўшчыны?.

Мы ад сябе яшчэ дабавім, што беларускае грамадзянства не памыліцца і ў тым, чаму Балаховіч узяўся на самы перш змагацца з беларускім урадам, гэткім на яго думку бясьсільным?.

Бо гэта на самы перш патрэбна таму, хто Балаховічам, Аляксюком і падобным тыпам дае грошы.

---

2. *Кляс буржуазіі.*

Пачатак утварэньня кляса буржуазіі, або мяшчанскага кляса, адносіцца к XII і XIII веку. Піанэрамі яго былі жыды. Яны жылі ў Беларусі на правох вольных гандляроў і пасрэднікаў яшчэ ў палавіне XII в. Пры вялікіх князёх Беларуска-Літоўскага гаспадарства жыды карысталіся вялікай свабодай руху і выбару заняткаў, хоць і не дапушчаліся ў армію і зямянска-служылы, або шляхоцкі, кляс. Пры Вітаўце яны вядуць шырокі гандаль у Бярэсьці, Горадні, Троках, Луцку, Вільні, Коўні, што відаць з яго граматаў 1388 і 1389 г. г. Казімір-Ягайла даруець грамату жыдам Вільні, Коўні, Трок на права іхняй мяшчанскай аўтаноміі (магдэбургскае права). Уладыслаў IV падцьвяржаець правы жыдоў мець свае месныя рады (соймы). Унія адчыніла дарогу жыдам з Польшчы, дзе іх прыціскала польская шляхта. У разультаце ў Беларусь і Літву напльваець жыдоўскі гандлёвы (і рамесьніцкі) кляс.

Канечна патрэбна астанавіцца на разьвіцьці мясцовага і месьцячковага жыцьця ў сувязі з так званым „магдэбургскім", або „саксонскім", правам.

Многа беларускіх местаў пачало паўставаць яшчэ ў IX веку. Гістарычныя месты паміняюцца ў летапісах: Полацк—ў 862 г., Тураў—980 г., Менск, сталіца Беларусі (гістар. „Менеска"),— у 1066 г., Вільня, сталіца вялікага князя Гэдэміна,—X в., Магілеў—у 1267 г., Смаленск—882 г. і г. д. Агулам кажучы, шмат цяперашніх губэрскіх і паветавых местаў паўстала яшчэ у IX і X веку, г. ё. задоўга да Беларуска-Літоўскай уніі (1252 г.). Мясцовыя і месьцячковыя жыхары займаліся гандлем, рамяслом, пасрэдніцтвам і мелі свае ўнутраныя распарадкі. Гэтыя распарадкі складаліся ў працэсе месных звычаяў. У канцы XII веку ў Беларусь і Літву было занесена цераз Польшчу і Сілезію з Саксоніі так званае магдэбургскае права. Гэтае права разам з звычайным месным правам азначыла далейшы ход мяшчанскага ўкладу. Па гэтаму праву, кожды прыватны гаспадар маемасьці места выдаець сваім падданым—мяшчанам асобныя прывілеі. У прывілеях гаворыцца аб правох і абавязках падданых. К абавязкам адносілася нясеньне натуральных і грашовых падаткаў, слухмянасьць і падтрыманьне парадку і да таго пад. К правам адносілася—выбар мястовага грамадзкага суда, вольнасьць гандлю, збораў з гандлёвых і іншых устаноў, выробкі сьпірту (пропінацыя), права арганізоўвацца ў мястовыя рады. З гэтых правоў вынікала асобная адміністратыўная і гаспадарчая арганізацыя места: вярхоўная ўлада належылася гаспадару (Малому або Вялікаму князю, магнату), ўлада распарадкуючая—мястовай радзе; гаспадарчыя функцыі находзіліся у руках асоб і цэхаў, г. ё. асобных камісій.

Такі распарадак мястовага жыцьця дазваляў клясу буржуазіі разьвіць найвялікшую дзеяльнасьць, аб'яднацца і выявіць свае клясавыя інтарэсы.

У мамэнт далучэньня Усходняй Беларусі да Расеі, г. ё. пры I падзеле Польшчы, на гэтаи тэрыторыі было сем местаў: Полацк, Віцебск, Дзьвінск, Магілеў, Амсьціслаўль, Ворша, Рагачоў. Месты Смаленскай губэрні ўваходзілі ў склад Расеі з 1514 па 1610 г., а затым з 1654 года, магдэбурскае права у Смаленску было адменена ў 1686 г. У далучаных ў 1793 годзе местах (Рагачове) панавала магдэбурскае права. Апрача местаў, налічалася 92 мясьцечкі. Мястовае насяленьне было залічана пад назовам „купцоў і работнікаў", а месьцячковае—пад назовам „жыхароў", бо тут цяжка было адасобніць кляс купцоў і рамесьнікаў. Ведамасьці таго часу паказваюць, што насяленьне усходня-беларускіх местаў складала 8 проц. усяго насяленьня краю, пры чым на долю „купцоў" прыходзілася блізу 65 проц., на долю „рукадзельнікаў—35 проц.

У мамэнт II і III падзела Польшчы к Расеі адыйшла рэшта гарадоў Беларусі. Мястовае насяленьне складала 10 проц. ўсяго насяленьня; саадносіны паміж „купцамі" і „рукадзельнікамі" блізу тое самае—65 проц. і 35 проц.

Такім парадкам, мы відзім, што сярод мястовага насяленьня пераважываець кляс гандлёва-прамысловы, што аб'ясьняецца большасьцю жыдоўскага насяленьня, якое займаецца гэтым рамяслом. Вышэй было адзначана, што жыды на Беларусі займаюць трэцяе месца і налічаюць да 1,2 міліёна чалавек (8 проц.)

У ліку разглядаемага кляса фабрычна-заводзкая група складала надта дробную велічыню. Аб'ясьняецца гэта тым, што гэтая форма прамысловасьці слаба разьвіта на Беларусі.

Ахапіўшы ўвесь буржуазны кляс трэба сказаць, што ён мала арганізаваны і аднавідны па сваму нацыянальнаму і прафэсіянальнаму складу. З эканомічнага боку ён рэзка распадаецца на бедных і багатых, што вынікаець з яго аднавіднага нацыянальнага складу і за парываньне ўсяго тутэйшага жыдоўства займацца спэкулятыўнай дзеяльнасьцю.

У заключэньне я прывяду табліцу, якая паказваець саадносіны ў Беларусі груп па віду заняткаў (перапіс 1897 г., хатнія выключаны):

Хто	займаецца	зямляробствам .	55,7 прац.
„	„	рамёсламі на фабрыках і заводах	12,9 „
„	„	батракоў, падзёншчыкаў	10,5 „
„	„	вайсков. справамі	6.0 „
„	„	гандлем . . .	5 2 „
„	„	паляваньнем, лясным промыслам .	2,1 „
„	„	прафэсыянальнымі абавязкамі .	2,0 „
„	„	невядомачым .	1,9 „
„	„	у адміністрацыі, судзе	0,8 „

Адкрытае пісьмо пану Ч. Янкоўскаму і іншым.

У маей стацьці „Наш культурны стан“ я даў, як умеў, згруба нарысованы абраз нашага культурнага стану.

Факты, пададзеныя мной, самі за сябе гавораць. А гавораць яны вельмі красамоўна, што вынікі культурна-нацыянальнае працы беларускага народу за колькінаццаць год перарасьлі ўсялякія спадзяваньні пачынальнікаў беларускага адраджэньня і служаць парукай сьветлай будучыны нашага народу.

Вам, панове, гэты яркі доказ, што **жыве Беларусь**, вельмі ня ў смак. Але фактаў адкідаць вы ня можаце. І спорку прынцыповую: чы будзе жыць народ беларускі, вы пераносіце на грунт звычайнае газэтнае полемікі.

Усіх выдатнейшых нашых дзеячоў з с. п. Іванам Луцкевічам — запраўдным тварцом сучаснага беларускага руху на чале, вы „анэктавалі“ да польскай, ці да маскоўскай нацыянальнасьці. Каталік—значыць паляк, праваслаўны—маскаль. А калі йшчэ бацькі дома гаварылі папольску, ці памаскоўску,—дык і пагатоў таго!

Старыя гэта песьні і даўно ўтраціўшыя ўсялякую вагу. Над імі пасьмяецца кожын, таксама, як пасьмяяўся-б ірляндзкі сін-фэйнэр, калі-б яму напомнілі, што ў малыя гады ён гукаўз бацькамі паангліцку. Пан Янкоўскі, вольным часам, сягнуў мусіць да арсэналу „аргумэнтаў“ „Kur. Lit.“ з-прад дзесяцёх год. І я ня лічу патрэбным на іх адказваць, бо ў іх хіба сур'ёзна ня можа верыць і сам аўтор.

Ня буду вясьці полемікі і з панам Л. Шчукай, каторы у „Słowie Żołn.“ вінаваціць мяне ў „анэктаваньні“ на карысьць беларусаў польскага композытара Рагоўскага. Відаць, пан Шчука вельмі слаба разумее беларускую мову і ня сьцяміў таго, што я пісаў аб Рагоўскім і Карловічу. Але, калі ня дуж, не бярыся за гуж! — кажа наш народ. І пану Шчуцы я-бы радзіў пазнаёміцца з беларускай мовай настолькі, каб разумець, што ён чытае.

Дый ня ў тым справа. А справа вось у чым:

Вы, панове, рупячыся аб карысьць польскага народу, каторы лічыце „сваім“, благую услугу робіце гэтаму народу: вы бачыце, як нарастае з-дня на дзень новая сіла ў нашым краі — сіла беларуская, вас зьнімае страх перад ёю, але, замест таго, каб папярэджваць аб гэтым „сваіх“, вы, быццам страўс-птушка, хаваеце свае галовы, заплюшчаваеце вочы і крычыцё: „Нічога няма, бо мы ня бачым!“ Замест таго, каб загадзя датарнавацца да новага ўкладу сіл у нашай Бацькаўшчыне і не дапусьціць да такога абастрэньня беларуска-польскіх адносін, да якога дайшлі літоўска-польскія,—вы, панове, самі спараджаеце ў беларусаў злосьць да тае польшчыны, якую вы „бароніце“. І на вас ляжа адказ за тыя абмылкі, якія вашае грамадзянства можа зрабіць у ваднасінах да беларусаў, апіраючыся на вашым асьвятленьні беларускага руху.

Ант. Навіна.

ХВАРОБА І ЛЯКАРСТВА АД ЯЕ.

VII.

Той заўседы робіць добрую палітыку, хто першы зьдзівіць сьвет несправядлівасьцю...

Тымчасам гарматы ня сьціхалі, а пялі далей пад ударамі іх многапудовых ладункаў зьнікалі з паверхні зямлі ня толькі гарады, а і царствы, каб даць дарогу новым. І гэта збылося. Рухнула у правальле Расея, паляцела за ёй і Аўстра-Вэнгрыя, а на іх месцы, як пасьля дожджу грыбы, сталі зьяўляцца іншыя гаспадарствы. Паўстала Чэхія, Літва, Лацьвія, Югаславія, Фінляндыя, Польшча і іншыя і сталі паміж сабой дзяліць спадкі сваіх пахаваных паноў.

Паміж імі таксама не абышлося бяз лаянак. А Польшча ўчапілася Савецкай Расеі ў валасы, і яны пачалі тузацца, — а за што?—За нас, за нашу зямельку, за нашы хаткі, за Беларусь.

Кожны з гэтых нашых „апякуноў“ крычаў, і цяпер, яшчэ крычыць, што па праўдзе яна павінна належыць толькі яму і што гэтага хоча большасьць нашага народу. Каб тое давясьці, кожны ссылаўся на „фактычны“ лік сваіх прыхільнікаў. І трэба прызнацца, што лічыць умелі ня блага і мелі лёгкую руку, бо кожны з іх налічыў у Беларусі каля 12 міліёнаў сваіх прыхільнікаў.

VIII.

Хаця чорт—абы новы.
Прыказка.

Такім парадкам усе даўнейшыя вывады аб скорасьці размнажэньня людзей адразу паляцелі наскрозьдоньне, бо амаль што праве за паўгоду лік люднасьці Беларусі, праўда на паперы, вырас да 24 міліёнаў (12 міліёнаў прыхільнікаў Масквы і 12 міл. прыхільнікаў Польшчы).

Аднак, скора Маскве прышлося праканацца, хоць яна аб гэтым нікому не прызнаецца, што яе прыхільнікаў, асабліва на вёсках, на Беларусі ня так ужо багата. Аб'яўлены прызыў у маскоўскую чырвоную армію, стварыў цэлую армію „лясьнікоў“, бо уся беларуская моладзь пашла „пільнаваць сваіх лясоў“.

Радаваліся, гледзячы на гэта, палякі, бо то „лішні раз давадзіла, што народ іх любіць і чакаець“. І праўда змучаны народ на мамэнт забыўся аб усім даўнейшым, забыўся навет аб тым, што было яшчэ там нядаўна, падчас таго, як Доўбар-Мусьніцкі гуляў па Магілеўшчыне і Меншчыне. Ды і як жа было не забыцца аб тым, што было даўней, калі цяпер палякі йшлі даваць ім „вольнасьць“.

Але вось і прычакалі таго мамэнту, што бальшавікі пачалі уцякаць. К вечару іх ужо і след прастыў. Усю ноч людзі былі як-бы не свае: хадзілі ад хаты да хаты, паглядалі на захад і аб чымсьці шапталіся. Сям-там зьявіўся „лясьнік“, хтосьці прывёў коні з лесу, гдзе тыя былі схаваны. Пад паветкай сьмела, хоць і ўночы, цюкаў сякач па траве, бо кабета, відаць, хоць раз захацела накарміць у волю сьвінчане. З усходам сонца хтось прыпяёўся з недалёкага мястэчка і расказаў, што палякі пайшлі кругом увабход і напэўна абкружылі бальшавікоў, бо іначай яны-б так пасьпешна не ўцякалі-б. Гэта дадало яшчэ больш адвагі і пэўнасьці, што скора зьявяцца і тут палякі і сяляне пачалі, поячы коні, сьмялей скрыпець асьверамі.

І толькі што бабы затапілі ў печах, як блішчучы доўгімі шаблямі, пачалі высыпаць з лесу „маляваныя дзеці“. За імі пацягнулася пяхота і артылерыя. Так пачалося у XX веку бліжэйшае знаёмства нашых сялян з другім нашым суседам Польшчай.

IX.

А мы вас так чакалі...
З расейскага.

Першых некалькі дзён было ўсё як ня трэба лепі. Добра адзетая і аджыўленая польская армія, лік каторай у параўнаньні з маскоўцамі быў надта малы, не рабіла многа шкоды. Беларусь была названа „Усходнімі Крэсамі“, а ўсе беларусы польскімі грамадзянамі. Прыехалі з Варшавы старасты, чыгуншчыкі, пачтавікі, судзьдзі, вучыцялі і т. д. і пачалі таксама выкідаць усё беларускае, як і даўнейшы расейскі ўрад. У губэрнях, паветах і валасьцёх запанавала польская мова, не зважаючы на тое, што яе слаба хто разумеў, не гаворачы ўжо аб тым, што гаварыць ня мог праве ніхто. І ўсё гэта клалася на мужыка, а пан усюды застаўся сухім, бо „гаварыў папольску“, крычаў на селян, што яны дурні, бо не гавораць папольску, а „пахамску“, на „мешаніне польска-расейскай“. Зьявіўся на астатку і падатковы інспэктар і пачаў зьбіраць падаткі, а на што... Пэўна што не на беларускую карысьць. І аб гэтым добра ведаў народ, але мусіў маўчаць.

Дагадаліся тут сяляне, чаму гэта так, дагадаліся, што ім трэба рабіць і засьпявалі: „Ад веку мы спалі і нас разбудзілі, мы знаем, што трэба рабіць“..

Цяпер ніхто з іх не казаў ужо, што ён хоча належаць да Польшчы альбо да Расеі.

Астаўся быў толькі адзін элемэнт на Беларусі—шляхта і абшарнікі, каторыя ніяк не маглі вылячыцца ад чужаманства.

X.

Гдзе любяць, там не учашчай,
А гдзе ня любяць-там і нагі не устаўляй.
Прыказка.

Сьледам за ёй пацягнулася і наша шляхта з абшарнікамі, забіраючы з сабой скаціну, збожжа і што мага іншае, думаючы, што ў Польшчы для іх будзе рай, што ў Польшчы ўсе спаткаюць іх так, як калісь спатыкалі яны іх. Толькі праўду, відаць, кажуць старыя людзі, што там добра-гдзе нас няма. Пакуль ехалі да Бугу, было нішто. Хоць і блага было начаваць у вясковай хаце, але ў ёй заўсёды знайшлося месца для начлегу, у студні хватала вады для жывёлы, а для дзяцей можна было дастаць і млека. Але вось нашы цікунцы перавалілі за Буг, і ўсё перамянілася. Як на беднага Макарку шышкі, так тут на нашых цікунцоў пасыпаліся розныя няшчасьці. Перш за усё іх зразіў ціхі сьмех, якім іх спатыкалі ўсе тыя, з кім яны хацелі гаварыць ці гаварылі. Доўга яны аглядалі адзін аднаго кругом і, не знаходзячы нічога надзвычайнага, ламалі галовы, чаго гэта з іх так усе сьмяюцца. І хто ведае, як доўга яны мучыліся, каб не селянін, каторы праз сваю наіўнасьць зрадзіў увесь сакрэт.

— Ці паны выпадкам не маскоўцы?—спытаўся ён іх.

— Чаму?

— Бо добра гаварыць ня ўмееце папольску, а усё неяк нібы з чужога перакручываеце,—адказаў ён ім і ўжо не зважаючы паплёўся далей за возам гною.

Праехалі ня мала мястэчак, пакінулі ў баку Варшаву. Сонца высока стаіць на небе і, як распаленае зялеза, пячэ чалавека і ўсё жывое. Змучаныя даўгім падарожжам людзі і скаціна чуць пляцуцца на дарозе. Усіх пачынае мучыць смага. Ахота і аддыхнуць, але гдзе. Вун відаць фальварак; там можна будзе папасьціць скаціну, напаіць яе, ды і самім аддыхнуць. І ўзрадаваныя людзі паялічываюць крок і панукаюць скаціну. Вось наастатку і брама, недалёка відаць скошанае канюшынішча, у падворку студня. У браме нашы цікунцы спаткалі неякага чалавека і па тым вялікім ахапку ключоў, які ён меў з сабой, адразу дагадаліся, што гэта гаспадар.

— Калі ласка, паночак, ці ня можна-б было напаіць ля студні жывёлу і аддыхнуць вун там на канюшынішчы, бо надта згаладалася і змучылася.

— Не, у мяне ня будзе можна, бо ваду нядаўна замуцілі і выбралі уланы, так што цяпер нікому ані вядра болі ня дам, а аддыхаць на канюшынішчы таксама не дазволю, бо хачу, каб атава адрасла. Можа ў каго іншага паном і дазволяць. Тут недалёка другі фальварак,—адказаў ім той.

— Але-ж, паночак, мы бежанцы, чуць ня месяц як у дарозе, змучыліся, жывёла прыстае... Будзьце ласкавы.

— Дык што, што бежанцы. Віджу, што бежанцы... Ня трэба было ўцякаць... Што вы думалі, што мы за вас будзем працаваць і ваяваць. Але няма дурняў. Можаце, паны, ня траціць часу і ехаць далей. З гэтымі словамі ён зьняў шапку і пакланіўся.

Зразумелі тут нашы цікунцы, што даўжэйшая гаворка напрасна і заціснуўшы зубы папляліся далей. Доўга прышлося ім цягацца ад фальварка да фальварка, але наастатку-ткі знайшлі месца для адпачынку, пачалі пасьціць і паіць жывёлу, узяліся і самі за падвячорак. Хлеба і закрасы мелі досыць сваей, але сухое есьці ня надта-то добра і для старых, а тут ёсьць і дзеці. Для іх ня блага было-б дастаць і малака.

Пашлі да гаспадыні, „так і так, будзьце ласкавы“. Малако знайшлося, на цану сышліся, бо і не таргаваліся, яго ўжо адмерылі. Але вось пачалі разлічывацца і ў нашых цікунцоў не хваціла маркі. Як не прасілі гаспадыню ўступіць ім гэту няшчасную марку, нічога не памагло, і кварта была адліта назад.

— Панічка, мы няраз паілі і кармілі вашых салдат.

— Э, што там кармілі... Кармілі, бо яны вас баранілі ад бальшавікоў, а цяпер за гэта на нас увесь сьвет крычыць,—сказала гаспадыня і кудысьці пайшла.

На гэтым ня скончылася. На кожным шагу спатыкалі нашым цікунцоў усе новыя і новыя неспадзеўкі. То ім не давалі кватэры, то таго, то іншага, не гаворачы ўжо аб тым, што на кожным кроку сьмяяліся з іх мовы і звычаяў. Як нельга лепі праканаліся яны тут, што яны не палякі.

Ня доўга прышлося быць ім на чужыне, а навучыліся многа, бо навучыліся шанаваць усё свае. Варочаючыся назад дамоў, яны ня мінулі, праўда, Варшавы. Толькі цяпер першае месца куды яны сьпяшылі, гэта была Шпітальная вуліца, 12, пам. 29, гдзе месьціцца Беларускі Нацыянальны Камітэт.

Добрае лякарства ад нашай хваробы, але дарагое, бо ў часе лекаў згарэлі нашы вёскі, скапаны нашы ніўкі, разграблены гаспадаркі, высячаны лясы і т. д., але затое Беларусь цяпер ведае, гдзе яе шчасьце і што ёй могуць даць яе суседзі.

В. Грыневіч.

Школьныя тыпы.

I.

Мікітка.

Як паехаў Кукор у заработкі у Рыгу, дык колькі ўжо часу мінула,—ні грошы, ні пісьма дамоў ня прыслаў. Але Кукорыха дала сабе раду: і дзеткі пад'еўшы і сама не галодная. Улетку, чуць сьвяток уздымецца, кароўкі сваей няма—гнаць у поле некага, у печы вытапіць, есьці зварыць, узбудзіць старэйшага сынка, сямёхгадовага Мікітку і ў ягады ці ў грыбы яго выправіць, або ў хаце за гаспадара пакінець: меншых Параску і Агатку дагледаць, парасяці ахрап'я назьбіраць і зьсячы. А сама—пашла; то у двор на падзённую, то да суседзяў-багатыроў. Свае вясковыя лепш, хоць і працы вымагаюць, але і пакормяць палюдзку і грошы заплоцяць.

А Мікітка ў хаце парадак наводзіць. Падлогу падмяцець, — куру-дыму падымець паўнюсенькую хату, на дзяцей насварыцца, каб ня крычэлі і ня біліся, у гарод споўзаець, травы назьбіраець; пакуль зьсячэць, тое-гэнае, аж і вечар ёсьць. Вернецца матка, закруціцца па хаце, зараз і гарачай стравы падрыхтуець, дзякаваць Божухну, і спаць можна класьціся.

Так і восень падышла.

Раз, пад вечар, апынуўшыся ў хаце, матка увідзела, як бяжыць міма іх вакон дзяцьвішча са школы, і зачапіла сына.

— Ну, Мікіта, стройся і ты ў школу. Гарасімавы дзяўчаты яшчэ і ў поле ня кінулі ганяць, а ужо ходзяць. І табе пара.

— Няхай сабе ходзяць, — забурчэў Мікітка.—А я не пайду. Хто-ж у нас гаспадарку правіць будзець?

— Ну, можа неяк абойдзецца, — засьмяялася маці,—я ўжо тваю работу спраўлю як-небудзь.

— Не, мне і бацька казаў, каб я гаспадаркі даглядаў. А вучэньне тое, Бог з ім, пасьпеецца, — хоць троху ужо няпэўным голасам,—а ну, як матка ўсё-ж пагоніць у школу,—сьпіраўся сын.

Але тая на ўспамін аб бацьку засмуцілася і гутарка так і зышла на пустое.

Сядзе пад вечар Мікітка ля вакна і глядзіць, як шкаляры бягуць дамоў. Цікаўна быць у такой кумпаніі,—што ён усё з малымі, як дзед які стары. Але там большыя скубаюць меншых (ён і сам сваім малым сёстрам надта расхадзіцца не даваў, дык то ён), б'юцца. А яшчэ самае горшае: няма чаго апрануць Мікітцы. Матчына старая ватоўка каля дома нішто—цёпла, а ў вучылішча сорамна ў ёй ісьці, — які ён мужчына і гаспадар, калі ў бабскай адзежы пойдзець. Дзе-ж гэта зразумець матцы?

Было-было пуста, але раптэм стала густа. Дастала маці з пошты павестку на грошы і на пасылку. Не пакрыўдзіў Кукор сваей бабы. А ў пасылцы што было: новае сіняе пальто з бліскучымі „залатымі“ гузікамі і новыя боты для „маладога гаспадара і майго дарагога насьледніка“.

Надуўся Мікітка ад важнасьці, як той індык. Узьдзенець боты, надзенець пальто і ходзіць, аглядаючы сябе, па хаце. Сёстрам ані дакрануцца да яго, навет калі маці, радая і гордая з бацькавага падарунку, возьмецца рукамі за сукно, каб разгледзіцца ў гатунку, нешта ўколець Мікітку: каб толькі не папсувала як-небудзь. Адабраць пальта не адбярэць, у пісьме ясна было сказана,—усе чыталі: „маладому гаспадару і майму дарагому насьледніку“. Трэба адпісаць бацьку.—„Э, брат ты мой,— падумаў, — ніяк ужо ад школы не адкруцішся“.

Назаўтрае ўстаў рана-раненька, пад'еў і ўзяўся апранаць новае пальто.

— Куды ты?—зьдзівілася маці.

— У школу,—важна адказаў сын.

— Чаго цябе так рана нясець? За-

рупіла. Пальтом пахваліцца хочаш, каб парвалі там.

— Пальтом пахваліцца! — зачырванеўся і загневаўся хлапец. — Тата просіць, каб часьцей пісалі, што-ж чужых людзей прасіць, трэба самому научыцца.

Адчыніўшы дзьверы ў клясу, Мікітка троху прыстоіў на парозе, потым пасунуўся ў куток за дзьвярмі ля вакна, дзе заўсёды станавіліся першачкі й жадалі пакуль увойдзе ў клясу настаўніца і ўвідзіць.

Дзяцей у клясе было няшмат. Ішчэ па вёсках у поле ганялі, іншыя з работай ўдаму не паўпраўляліся, дык большасьць дзяцей былі Мікітавы равесьнікі-першагоднікі.

Мікіта спакойна стаяў у куце і аглядаў свае гузікі і боты. Ен не памыліўся ў сваіх прадчуваньнях: хараство яго убора далося ўвочы.

— Глядзіце, якое пальто у Мікіткі. Сіняе. Гузікі блішчаць. Як раз земскі.

Мікітка набраў поўныя шчокі паветра і раптам шумна выдыхнуў. Некаторыя падскочылі да Мікіткі і стаялі моўчкі з падзівам. Іншыя прыставалі да яго: „Скуль у цябе? Будзеш у ім хадзіць? Ня ўжо?“ А нейкі дуронік сьмела пацягнуў за жоўценькі бліскучы гузік.

Як увайшла ў клясу настаўніца дзеці разьбегліся па сваіх лаўках. Мікітка астаўся там адзін.

— Новенькі? — адазвалася настаўніца,—граматны?

— Не!—адказаў коратка і сам дзівіўся, што ані крошачкі не баяўся.

— Фамілія і імя?—узяўшы ў рукі журнал для запісу, пыталася далей.

— Мікіта Кукор.—А потым патураючым голасам дадаў.—А можаш і Мікіткай зваць.

Засьмяялася настаўніца, а за ёю—дзеці, навет тыя, што ня ведалі, чаго.

Ен ад гэтага сьмеху зусім не засаміўся і важна сеў на паказанае месца, пануючыся, каб не датыкнуцца да суседа.

Добрае пальто ў Мікіткі, ёсьць чым пахваліцца і пагардзіцца, але ня мог ён пахваліцца сваім вучэньнем. Сядзеў Мікітка спакойна, ня круціўся, ня дурэў, цягнуў доўга-доўга разам з другімі с-с-с-с-с, аж пакуль духу хапала, і толькі адно гэтае с і ведаў.

— Ці скора бацьку пісаць будзеш?—зачапляла яго маці, калі ён увечары садзіўся з кніжкай за стол і цягнуў бліжэй да сябе лямпачку.—Усё сыкаеш ды сыкаеш...—дакарала яна.

— „Многа ты сама разумееш“—хацелася сказаць, але ўстрымліваўся і думаў, што нядарма яго не цягнула ў школу, калі трэба так мазгамі круціць.

Восень ўсё больш і больш насувалася, дождж, балота; трэба асьцярожна йсьці бакавой сьцежачкай, каб ня дужа запэцкаць у гразі боты. Ля школьнага будынку разьлілася вялікая шырокая лужына,—скуль і ўзялася такая? Перахадзіць цераз яе трэба было па кладачках, высьцярагаючыся ступаць моцна, каб канец дошкі ня высьлізнуў з пад ног і не боўтнуўся ў ваду.

Нудная шэрая ймгліца. Выйшла настаўніца, акруціўшыся вялікай цёплай хусткай, на ганак, глядзіць як зьбіраюцца ў школу дзеці. Хто шыбка бяжыць, а хто па самаму балоту нагамі плёхаець; падходзячы к ганку, скідаюць перад вучыцелькай шапкі і асьцярожна ступаюць па кладачках. Ціхім мерным ходам падыйшоў і Мікітка, узышоў на дошкі, дабраўся ўжо да палавіны лужыны і тады толькі ўгледзіў на ганках настаўніцу. Схапіўся за шапку, ногі пасьлізнуліся, матнуўся ў адзін бок, у другі і боўць у лужыну. Устаў мокрымокры, брудны, брудны. І сорамна, і пальта шкода! І пальто раптам абрыдла і сам ня ведаў, што рабіць, як дзяржацца; зьняў пальто, першы раз за ўвесь час у школе, кінуў недзе ў сенцах, навет не павесіў і смутны, смутны прасядзеў усе лекцыі. Настаўніца відзела ўсю прыгоду і не чапала яго, а таварышы дакучалі, прадавалі зубы: «Земскі гузікі згубіў, у бруднай лужы утапіў“. Маўчаў. Як кончыліся заняткі, знайшоў сваё пальто ў сенцах пад нагамі, бруднае, надзеў з агідаю і пацягнуўся дамоў. Ну, а маці, ведама жанчына, абабіла, не распытаўшыся як і што было. Ды ці яна зразумееці? І што яму тое пальто, ён сам па сабе малайчына.

На другі дзень, як заняткі ў школе йшлі ўжо з добрых поўгадзіны, зьявіўся ў школу Мікітка. Ужо ў тым як ён адчыніў дзьверы і ўскочыў у клясу—неяк бокам-бокам, было толькі нязвычайнага для таварышаў, што тыя глядзяць на яго, а Настася Зайчышка, яго суседка па лаўцы, калі ён сморгаючы носам, са стукам сеў за стол, голасна на ўсю клясу папыталася: „Здурнеў ты, Мікітка, ці што?“

Сіняга пальта з залатымі гузікамі на ім ня было. Старая, зашмальцаваная на лакцёх матчына ватоўка замяніла пальто. Але разам з залатымі гузікамі скінуў Мікітка і сваю важнасьць. Шчокі не надуваліся, як звычайна, вочы ажывіліся і ў мазгох з літарамі большы парадак зрабіўся. Дзень за днём кождай літары знаходзілася ў галаве сваё месца, і мусіць - ткі бацька пад вясну дачакаець пісьма ад свайго „маладога гаспадара“.

Л. Г.

25/I--21.

У клясе.

Шумна у клясе, шумна і нудна,
Сьцены шырокія давяць мяне,
Словы вучыцеля ціха, марудна
Льюцца, іх слухаць ня хочацца мне.
Там, ля дзвярэй так вясёла сьмяюцца,
Тыя чытаюць, а тыя—крычаць.
Я ўсё гляджу на праменьні, што ўрвуцца
У цёмную клясу і ў шыбах гараць.
А з-за вакна мне шапочуць тапалі,
Неба сінее прыветная даль,
Даль, што ня зьведаць яе нам ніколі,
Сьветла-празрыстая, быццам крышталь.
Дыхаець сьвежасьцю сад павлачэлы,
У салі: «Ад веку мы спалі» пяюць.
Нудна сядзець мне у клясе дзень пэлы,
Калі праз вокны паціху, бясьмела
Восені гукі плывуць...

Натальля Арсеньнева.

Безработны.

Э , невясёлыя весьці!
Зноў мне сказалі там: не!
Есьці мне хочацца, есьці...
Божа! дай есьці ты мне!
Хто мяне гнаў сюды ў горад?
Гдзесь малаціў бы ў гумне,—
Еў бы, ня знаў-бы, што голод...
Есьці, ах, хочацца мне!
Вось магазын повен хлеба
Там на паліцах, вакне...
Смашны такі, белы... Неба...
Хоць бы чуць, хоць скарыначку мне.
Цьфу, дзе іду? не дадуць-жа,
То не для нас, бедакоў,—
Стой... а куды ж холад, сьцюжа.
Божа я ўпасьці гатоў.
Далей... да хаты... Дзе хота?
Ну, за другімі. Бог мой,
Пах нейкі з сала... Як часта
Лезе у ноздры у кроў...
Цёмна... нічога ня знаю...
Стой жа, а дзе гэта я?
Я на беразе, саменькім краю
Мост вунь, дорожка.. Вільля.

Ігнат Дварчанін.

Беларуская Рада Народных Камісарау.

У Цэнтральны Спаўняючы Камітэт Беларускай Савецкай Рэспублікі увайшлі: Старшыня рады і камісар заграничных спраў — Чарвяк, вайсковых спраў—Адамовіч, унутраных — Мэртэнс, асьветы — Ігнатоўскі, аправізацыі — Адамайціс, працы — Ценкін, здароўя — Ілуцкі, гаспадаркі — Хадасевіч, камунікацыі — Грыдзюшка, фінансаў — Сэгаль, юсьціціі — Гофнэр, работніцка-сялянскай інспэкцыі (гас. кантроль) —Найхін, грамадскіх прытулкаў—Каценбоген, старшынём Сав. Нар. Гасп.—Вайнштэйн, старшыня Надзв. Кам —Ротэнбэрг. У прэзыдыум Ц. С. К. увайшлі Чарвяк — (старшыня), Кнорын, Адамовіч, Мэртэнс і Ашмарын (сэкрэтар).

Беларусь і Маскоушчына.

Як паведамляюць з Рыгі, савецкі пасол затрэбаваў ад лацьвійскага ўраду выдаленьня прадстаўніка Беларусі пад тэй прычынай, што прадстаўнік саветаў зьяўляецца прадстаўніком і для Беларусі. (Е. Е.)

У Савецкай Беларусі.

Пры перавыбарах у савет у Віцебску ў склад савета ўвайшло 30 бальшавікоў, 26 меншавікоў і 57 беспартыйных.

ШТОДЗЕННЫЯ ВЕСТКІ.

Чацьвер, 3 лютага 1921 г.

Нямеччына і **Расея.** Прадстаўнік Расеі Копп прапануець нямецкім фірмам розныя концэсіі, куды карысьнейшыя для немцаў, чым прапызыцыі Красіна ў Лёндане. Апрача таго, ён фармуець армію з інтэрнаваных чырвонаармейцаў.

Антанта дамагаецца ад Нямеччыны выпаўненьня ўсіх пунктаў Вэрсальскага дагавора, інакш паграджаець заняцьцем новых тэрыторый і адмаўляецца прыняць Нямеччыну ў Лігу Народаў.

Францыя. У Тулоне ўзрывамі чатырох знарадаў зьнесен ваенны завод. Людзкіх ахвяр ня было. Думаюць, што знарады падклалі звольненыя ўласьнікам завода работнікі.

Англія і Сэрбія. Сэрбы арыштавалі ангельскага прадстаўніка, які прыехаў у Чарнагорыю, каб расьледаваць тэрор, які вядуць сэрбы ў адносінах да чарнагорцаў.

Нямеччына. Палітычныя кругі чакаюць кабінэтнага крызісу ў Бэрліне ў зьвязку з няўдачамі дзеля немцаў на парыжскай конфэрэнцыі.

Пятніца, 4 лютага 1921 г.

Польшча і Расея. Мірныя перагаворы ў Рызе зацягнуліся, бо прадстаўнікі абедзьвюх старон ня могуць прыйсьці да згоды ў фінансава-гаспадарчых пытаньнях. Пасьля даўгіх спрэчак Іоффэ згодзіўся ўступіць Польшчы 30 мільёнаў золатам, але старшыня польскай дэлегацыі Домбскі дамагаецца 11 процэнтаў ад 629 міліёнаў рублёў.

Украіна. 30 студня у Варшаве урачыста адчыніліся паседжаньні Рады Украінскай Рэспублікі пад старшынствам галоўнага атамана войск Украіны Сымона Пятлюры. З 67 сябраў Рады Рэспублікі было прысутнымі блізу 50 чалавек. (Е. Е.).

Расея. Здароўе пахаванага газэтамі анархіста П. Крапоткіна палепшылася.

Субота, 5 лютага 1921 г.

Польшча пратэстуе проціў расстрэлу бальшавікамі палоннага ўлана 10 палка Чэслава Яблонскага.

Расея. У Маскве ў канцы сьнежня адбыўся зьезд польскіх камуністаў, на якім быў выбраны камітэт; у склад яго увайшлі: Пярхоўскі, Ганецкая і Пшыбышэўскі.

МАСКВА 3. 2. (Е. Е.). Дзеля нястачы прадуктаў адменены пайкі для некаторых катэгорый, як напрыклад, акадэмічны паёк.

Паудневая Славія. *Белград.* 3. 2. (Е. Е.). Урадам зачынены сеў соцыялістычныя газэты і работніцкія клюбы. Камуністычная партыя зьліквідавана і сябры яе перададзены вайсковаму суду.

Сэрбы і чарнагорцы завяліся паміж сабою. З абодвух бакоў 122 забітых.

Сірыя. Сірыйскія паўстанцы прымусілі французскія войскі з вялікімі стратамі выйсьці з Сірыі.

Нядзеля, 6 лютага 1921 г.

Нямеччына ня хоча згаджацца на выплату контрыбуцыі, бо дамаганьні Антанты перавышаюць магчымасьць выпаўненьня.

Польшча. У Маскву выяжджаець польская дэлегацыя па справах рэвакуацыі польскіх грамадзян у Польшчу.

У Данцыгу царкоўная ўлада ўціскаець польскіх ксяндзоў за польскую мову ў касьцёлах.

З 1-га сакавіка (марца) адкрываюцца новыя ваяводзтвы: Наваградзкае, Валынскае і Палескае.

Начальнік Польскага гаспадарства Пілсудскі абмяняўся візытамі з Мільеранам.

Польскі ўрад са слоў Вітаса разумее важнасьць пытаньня аб правох яўрэяў у Польшчы.

Эстонія і Лацьвія прызнаны скандынаўскімі гаспадарствамі.

Францыя. 30 студня закончылася конфэрэнцыя прэм'ераў.

Румынія і Расея. Для расейска-румынскіх перагавораў румынскі прэм'ер Таке-Іонэску прапануець выбраць Рыгу.

Сярод белых расейцау. Расейскі парламенцкі камітэт у Парыжу падаў Брыану мэморыал аб гвалтах бальшавікоў і просіць грошы на арганізацыю астатняй белай арміі.

Панядзелак, 7 лютага 1921 г.

Нямеччына, як ідуць пагалоскі, ня рыхтуецца заплаціць навет палавіны таго, што ад яе вымагаюць хаўрусьнікі.

Савецкая фэдэрацыя і Польшча. Маскоўскае радыо заклікае польскіх чыгуншчыкаў і паштавікоў зараз жа пачаць генэральную забастоўку, а таксама распачаць змаганьне за савецкі лад у Польшчы.

Савецкая фэдэрацыя і Кітай маняцца, па прапазыцыі саветаў, зрабіць ваенны хаўрус.

Эстонія. У новым кабінэце міністраў розныя партыі маюць гэтулькі месцаў: земляўласьнікі — 4 месцы, партыя працы — 2 месцы, народнікі—1 месца, хрысьціянскія народнікі — 1 месца і беспартыйныя — 1 месца. Старшынёю міністраў земляўласьнік Пятс.

Заваяватель Беларусі. Дэпутаты сойму Грындбаўм, Гартлас, Шопэр і іншыя падалі вайсковаму міністру і міністру юстыцыі даклад у якім сабраны абшырны матар'ял аб рабаваньньях, убійствах і гвалтах, якія чынілі салдаты арміі Булак-Балаховіча з дазволу самога камандуючага над насяленьнем.

Аўторак, 8 лютага 1921 г.

Фінляндыя афіцыяльна абвяшчае аб узнаўленьні з Савецкай фэдэрацыяй дыплёматычных і гандлёвых зносін.

Бавярыя. На паседжаньні ландтага ў справе абмеркаваньня прапазыцый ад хаўрусьнікаў, прэзыдэнт Кенігбаўэр, пры воплесках

усяе салі, заявіў, што „немагчымае прынята быць ня можа“. Усе перагародкі ў нямецкім народзе павінны быць завалены, усе партыі, усе пляменьні паўдня і поўначы павінны аб‘яднацца: лепей з гонарам загінуць, чымся ганебна гніць дзень-у-дзень.

Новыя савецкія рэспублікі. „Известия“ паведамляюць, што ў складзе фэдэрацыі ўтварылася на тэрыторыі некаторых паветаў Пермскай і Уфімскай губэрн. вацяцкая рэспубліка, а ў Валагоцкай губэрні зыранская рэспубліка.

Серада, 9-га лютага 1921 *г.*

21-га лютага. З Парыжу паведамляюць, што паседжаньне Рады Лігі Народаў, на якім будзе разглядацца польска - літоўская спрэчка, адбудзецца 21 лютага.

Францыя. Надоячы зроблена шмат арыштаў і рэвізій сярод чужаземцаў, глаўным чынам, расейцаў і сэрбаў.

Амэрыка. У Нью-Іорку пачала выхадзіць расейская газэта „Сынъ отечества“, орган эсэраў.

Украіна. На паўдзённых дарогах шалее завіруха, дзеля чаго цягнікі (паязды) ня могуць хадзіць.

Румынія скуплівае аружжа і амуніцыю ген. Врангеля.

Чацьвер, 10-*га лютага* 1921 *г.*

Швэйцарыя адмаўляецца прапусьціць плебісцытнае войска ў Вільню.

Польшча. Начальнік гаспадарства Пілсудзкі вярнуўся з Францыі ў Варшаву.

Група камуністаў хацела зрабіць забастоўку на зялезнай дарозе.

Літва.

Нота Чычэрына.

РЫГА, 3 лютага (Е. Е.). Чычэрын падаў паслу Літоўскай рэспублікі ў Маскве ноту ў справе Вільні. У ноце гэтай гаворыцца, што Вільня зрабілася асяродкам белагвардзейскіх элементаў. Ліга Народаў хоча пасылаць у Віленшчыну войска, з боку якога можна чакаць той небасьпечнасьці, што яно прызначаецца дзеля нападу на Савецкую федэрацыю. Чычэрын выказуе надзею, што ковенскі ўрад нешта зробіць, каб ня пусьціць у Вільню пасыланага Лігаю Народаў войска, бо гэта пагражала-бы басьпечнасьці Савецкай федэрацыі. Хоць на грунце рыскага пралімінарнага замірэньня пытаньне аб гаспадарсьцьвенай прыналежнасьці спрэчных прастораў між Польшчай і Літвою падлягае разьвязаньню выключна гэтых гаспадарстваў, аднака, пакуль Польшча і Літва ня дойдуць да згоды ў гэтай справе, Савецкая федэрацыя лічыць савецка-літоўскую ўмову маючай сілу, а тым самым лічыць Вільню прыналяжачай Ліцьве.

Варункі плебісцыту.

Літва згаджаецца на плебісцыт пры варунках: 1) войска ген. Жэлігоўскага выходзіць з Вільні, 2) краем упраўляюць нейтральныя гаспадарствы, 3) Польшча гарантыруець, штс экспэдыцыя ген. Жэлігоўскага не паўтарыцца, 4) Польшча прызнаець раўнапраўнась Літвы.

КОУНЯ (Эльта). Літоўскі ўрад паслаў свой адказ Радзе Лігі Народаў на яе ноту ад 20 сьнежня 1920 г. Літоўскі ўрад выказуе пэўнасьць у падтрыманьні Лігаю Народаў рыхтаванага плебісцыту, з захаваньнем усіх патрэбных дзеля справядлівага нормальнага яго споўненьня варункаў, павядомленых у свой час Радзе Лігі Народаў літоўскім урадам.

Нямеччына і Літва.

У зьвязку з арыштам у Коўні нямецкага шпега, прадстаўнік Нямеччыны падаў Літоўскаму ўраду ноту пратэста з дамаганьнем звальненьня шпега і пагрозай выдаленьня з нямецкага ўнівэрсытэту ўсіх літоўскіх студэнтаў.

Польска-савецкі мір і Беларусь.

У зьвязку з польска-савецкімі перагаворамі Беларускае Бюро Друку паведамляе:

Польскае Тэлеграфнае Агенцтва прыводзіць чароднае афіцыяльнае паведамленьне дэлегацыі з Рыгі: надняx мае быць дэклярацыя савецкага ўраду аб прызнаньні ім, згодна з пралімінарнаю ўмоваю, незалежнасьці Беларускае рэспублікі у складзе губэрняў: Віцебскай, Смаленскай, Магілеўскай і Менскай. Гэтае гаспадарства будзе знахадзіцца ў фэдэрацыі з савецкай Расеяй.

Ня гледзячы на тое, што гэтым самым Беларусь, хаць-бы і „савецкая“, дасягае усёжткі сваіх натуральных межаў, мы тым ня менеей ня можам абмінуць моўчкі чародныя ўнутраныя супярэчнасьці, якія маюцца ў гэтай дэклярацыі раўнуючы да змыслу § 1 рыскага пралімінарнага замірэньня. У § 1 гэтае ўмовы абедзьве староны, Расея і Польшча, дакляравалі ўзаемна прызнаць незалежнасьць Беларусі. Тымчасам:

1). Савецкая Расея фактычна ўступіла Польшчы важныя ў культурных адносінах і насялёныя беларусамі часьці Віленскай і Горадзенскай губ.

2). Беларускай рэспубліцы накідаецца гвалтам савецкая форма ўрадаваньня, хаць увесь народ выказаўся яшчэ на ўсебеларускім зьезьдзе ў Менску ад 18—31 сьнежня 1918 г. за беларускую народную рэспубліку. На гэтым зьезьдзе было болей за 1167 дэлегатаў ад усіх слаёў насяленьня Беларусі і грамадзкіх арганізацыяў, абраных на шырокіх дэмократычных падставах, якія тады-ж абралі раду Беларускае Народнае Рэспублікі, раду народных міністраў, існуючую і дагэтуль. Сялянскія паўстаньні, якія ўвесь час адбываюцца ў савецкай Беларусі выстаўляюць і па гэты дзень кліч: „За Беларускую народную рэспубліку“, што зьяўляецца лепшым доказам таго, наскольні народны ўрад популярны ў краі.

3). Беларускай рэспубліцы накідаецца міма яе волі фэдэрацыя з Расеяй, хаця ўсе сымпатыі народа як-ёсьць на старане гістарычнага хаўруса з Літвою. Толькі фэдэрацыя з Літвою, якая дае Беларусі магчымасьць экономічнага разьвіцьця, будзе карыстаць папулярнасьцю ў краі. („Народное Дѣло“).

З Літоускага жыцьця.

Вайсковы музэй у Коуні.

На ўгодкі сьвяткаваньня незалежнасьці Літвы, 16 лютага, будзе адчынены вайсковы музей. (Straž Litwy).

Паміжнародны шахматны конкурс.

У Коўні пачаўся паміжнародны шахматны конкурс. (Straž Litwy).

Халера.

КОУНЯ. 3. 2 (Ор.) У месьце было зарэгістрыравана 12 выпадкаў хваробы на халеру.

У скандынаўскіх староnах прэса вымагагаець, каб скандынаўцы адмовіліся ад учасьця ў правядзеньні плебісцыту.

Вываз тавараў з Літвы.

У працягу 10 месяцаў 1920 года з Літвы было вывезена тавараў на 126,719,496 ост. мар. больш, чым прывезена.

Сельска-гаспадарчая конфэрэнцыя.

27-га студня ў Коўні ў мястовай салі адчынілася конфэрэнцыя літоўскіх сельскіх гаспадароў. Есьць болей за 200 прадстаўнікоў.

Новы Літоускі Камітэт у Вільні.

Старшынёю новага Літоўскага Камітэту ў Вільні абралі М. Біржышку, віцэ-старшынёю і скарбнікам кс. Кухту і сэкрэтаром—доктара Аўгевіча.

— Літоўскі пасол у Лёндане Тышкевіч вызван сваім урадам у Коўню.

— Камітэт літоўскіх яўрэяў у Амэрыцы падтрымлівае літоўскую пазыку за тое, што на Ліцьве яўрэі карыстаюцца ўсімі грамадзянскімі правамі.

— Літоўскія грамадзяне, якіх шмат было ў арміі Врангеля, ўтварылі ў Канстантынопалі свой асобны Літоўскі Камітэт, які прызналі прадстаўнікі Англіі, Францыі і Італіі. Камітэт распачаў эвакуацыю літоўскіх грамадзян на бацькаўшчыну.

З Беларускага жыцьця.

XX У Варшаве адбываецца якаясь важная нарада беларусаў польскай орыентацыі. З Вільні выехаў у Варшаву б. дырэктар апраўізацыі В. Іваноўскі і інш.

XX У Беларускім Клюбе ў Вільні маюць быць навуковыя лекцыі.

XX Выпусьцілі на волю інжынера К. Душэўскага.

XX Антона Грыневіча перавезьлі ў Варшаву.

XX Арыштавалі вучыцельку Т. Бярдзяеву і яе бацьку.

XX Ня гледзячы на ўсе стараньні ксяндза А. Станкевіча і лаварышскага пробашча ксяндза Семашкевіча, не ўдалося ўзяць на порукі арыштаванага „за беларускую агітацыю“ 18-летняга хлапца з в. Адамчукоў Лаварышскай парафіі А. Янкоўскага.

XX Беларускі Нацыянальны Камітэт арганізаваў юрыдычны аддзел, у якім працуюць добрыя адвакаты. Бедным помач даецца дарма.

XX Праездам з Каўказа ў Вену быў у Вільні шэф украінскай дыплёматычнай місіі ў Грузіі, вядомы беларуска-ўкраінскі дзеяч Краскоўскі.

Новыя кнігі.

XX Выйшла з друку драма Ф. Аляховіча „Страхі жыцьця“ і прадаецца ў Беларускай Кнігарні ў Вільні.

XX Выйшла з друку „Арытмэтычная тэрміналёгія“ і прадаецца там-жа.

XX Выдавецтва У. Знамяроўскага друкуе цяпер другое выданьне „Маскоўска-беларускага слоўніка“ братоў Гарэцкіх. Кніга папраўлена і значна дапоўнена. У бліжэйшым часе выйдзе ў сьвет.

Школьны аддзел.

Кроніка.

XX У Вільні адчыняюцца дзьве новыя пачатковыя беларускія школы.

XX У сяле Княгініне Вялейскага павету школа дагэтуль зачынэна, ня гледзячы на вялікае жаданьне сялян вучыць сваіх дзяцей. Тутэйшыя інтэлігенты-беларусы мала рупяцца.

XX Дырэктар беларускай гімназіі ў Шаркаўшчыне, Дзісенскага павету, гр. Балай прыяжджаў у Вільню ў справах гімназіі. Гімназія будзе існаваць толькі на кошт вучняў.

XX Горадзенская беларуская гімназія мясьціцца ў надта благім для здароўя будынку, а лепшага ніяк дастаць ня можа, бо маючыя ўладу не стараюцца памагчы.

XX На астатнім паседжаньні пэдагогічн. рады 1-ае Вілен. Беларуск. гімназіі пастаноўлена выкладаць праваслаўны закон божы пабеларуску і ў старэйшых клясах. Каталіцкі выкладаўся пабеларуску ўва ўсіх клясах яшчэ даўней. К пачатку новага вучэбнага году ўсе навукі будуць выкладацца ў гімназіі пабеларуску.

XX На дзьве старэйшыя клясы 1-ая Віл. Бел. Гімн. субсыдый ад ураду не дастае дзеля іх небеларускага характару.

XX Беларуская гімназія ў Вільні будзе рабіць вялікі спэктакль на карысьць маламожных вучняў.

XX У нядзелю 8 лютага ў салі 1-й Віл. Бел. Гімназіі інспэктар гэтае гімназіі вядомы фізык А. Дмахоўскі паказываў на простых прыладах фізычныя зьявішчы вучням Кальварыйскай і Зарэчанскай пачатковых беларускіх школ.

XX Кватэра дзеля прыяжджаючых у Вільню вучыцялёў яшчэ дагэтуль Вучыцельскім Хаўрусам ня ўсгроена.

Экономічны аддзел.

Перагляд аграрнага закону.

Аграрны закон, які выпрацавала ранейшая ўрадуючая камісія, цяпер пераглядаецца.

У камітэце апалу.

24 студня камітэт апалы ўцьвярдзіў одпуск апалу розным установам і прыватным асобам у ліку 720 вагонаў на люты.

Зьезд лясьнічых.

2 лютага ў Вільні адбыўся зьезд лясьнічых віленскай акругі

— У Вільню зьявіліся прадстаўнікі ад бэльгійскіх фірм, каб зрабіць умову аб дастаўцы вялікіх партый галантарэі і вобуву.

— З 1 га лютага электрычнасьць гарыць ад 10 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы.

— Дэпартамэнт апраўізацыі дастаў тры вагоны торфу.

— За астатнія дні дэпартамэнт апраўізацыі дастаў шмат новых прадуктаў, карасіны і сена. На тым тыдню прадпалагаецца выдача цукру па картках.

— Для віленскай акругі ў Варшаве пры раскладцы яравога насеньня вызначаны 250 вагонаў.

Тутэйшае жыцьце.

Расстрэл тэрорыстау.

Па прыгавору суда, 2 лютага у 9½ гадз. раніцы ў Зьвярынцу на беразе Вільлі, былі расстрэляны тэрорысты: Сьвечнікаў, Бачкоў, Волкаў і Вейсбах. Па жаданьню аднаго з асуджаных перад расстрэлам быў выкліканы сьвяшчэньнік Сасноўскі, які заставаўся да канца кары. Пры расстрэле быў прысутным майор Бобятынскі і іншыя вайсковыя асобы.

Рэшце асуджаных кара сьмерцьцю заменена турмой.

У камітэце помачы дзяцем.

Камітэт помачы дзяцём выдаў за студзень прадукты на 20 тысячаў бедных дзяцей.

У праваслауным камітэце.

Крымінальная паліцыя задзержыла зладзеяў, якія абакралі дзяціную кухню пры праваслаўным камітэце на 200 тысяч марэк.

Віленская біржа (гэльда).

9 лютага 1921 г.

Царскія 500 р. .	495—500	(за сотню).
„ 100 . . .	480	„ „
„ 10-25 . . .	440	„ „
Думскія 1000 р. . .	80	„ „
„ 250 . . .	60	„ „
Ост-маркі	1375	„ „
Нямецкія маркі . .	1425	„ „
Доляры . . .	810—815	„ „
Франкі	50	„ „
Фунты стэрлінгаў . .	3000	„ „
Золата 10 р. . . .	3700	„ „
Серабро (1 р. і 50 к.)	190—195	„ „

Дазволена Ваеннаю Цэнзураю. Рэдактар-Выдавец М. ГАРЭЦКІ Кооп. Друкарня „ДРУК“, Вострабрамская 5.